происходит у героя именно во сне), много событий остается как бы за кадром. Он не помнит, например, боя на станции Лозовой или того, как он жил уже в наше время до того, как попал в психбольницу, некоторые подробности он узнает только тогда, когда тайком пробирается в кабинет главврача Тимура Тимуровича и находит свою историю болезни. Но зато в деталях помнит свою петербургскую жизнь до революции. *«Какой недостижимо прекрасной показалась мне в этот миг прежняя петербургская жизнь!* [1, с. 92]

Таким образом, проанализировав эту тему, можно сделать вывод, что пространство и время у В. Пелевина решены весьма нестандартно. Через описания, развитие действия в различных городах, автор концептуализирует центр – Москву, и Петербург – сосредоточение европейскости, имперскости [1].

**Литература**


1. *Кузнецов С. В. Пелевин.* Тот, кто управляет миром // Огонек. 1996. № 35. С. 5–15.
2. *Немзер А*. Как бы типа по жизни // Литературная газета. 2000. № 27.
3. *Пелевин В*. Чапаев и пустота. М., Вагриус. 2001.
4. *Топоров В*. Петербург // Записки Татрского ун-та. 1967. С. 201–289.


# ДЫЯГНОСТЫКА УМЕННЯЎ СТАРШАКЛАСНІКАЎ ПА ІНТАНАЦЫЙНЫМ АФАРМЛЕННІ ВЫКАЗВАННЯЎ


**А. П. Літвінава**


Сёння ва ўмовах пашырэння дзелавых, прафесійных зносін, калі ўзраслі магчымасці самавызначэння асобы, узмацнілася патрэба ў навучанні рыторыцы – дзелавой і рамантычнай навуцы адначасова. Уменне лагічна і выразна перадаваць змест і значэнне выказвання, здольнасць самастойна прадуцыраваць тэкст звычайна не даюцца ад прыроды, інтуітыўна. Яны могуць выпрацоўвацца ў школе, дзякуючы мэтанакіраванай настаўніцкай дзейнасці ва ўзаемасувязі з выхаваннем моўнага густу, з фарміраваннем маўленчага этыкету вучняў.

Пры сучасным хуткаплынным нарастанні інфармацыі ўзрастаюць патрабаванні да гукавой афарбоўкі маўлення, для забеспячэння якаснай перадачы звестак адрасату. Менавіта сэнсавая рэльефнасць, рытмічнасць, эмацыянальнае багацце інтанавання сведчаць аб культурным развіцці асобы, спрыяюць яе паспяховай адаптацыі ў грамадстве. А гэта значыць, што асаблівую актуальнасць у школе набывае праблема развіцця вуснай мовы школьнікаў. Таму вяртанне рыторыкі ў школу, асвятленне асобных рытарычных пытанняў і палажэнняў на занятках па беларускай мове заканамернае.

Праграмамі па беларускай мове ў старшых класах агульнаадукацыйнай школы прадугледжаны абагульненне і сістэматызацыя ведаў аб інтанацыйных сродках маўлення разам з удасканаленнем уменняў па прасадычным афармленні выказвання (спецыяльна гэта ажыццяўляецца пры засваенні тэм «Стылістычныя сродкі фанетыкі» ў 10 кл. і «Інтанацыйныя сродкі вуснай мовы» – у 11 кл.).

Абагульненне звестак аб такіх інтанацыйных сродках, як мелодыка, націскі і паўзы, тон і тэмп маўлення, накіравана на аптымізацыю прасадычнай абалонкі выказванняў школьнікаў. Інтэграцыя атрыманых уяўленняў пра розныя кампаненты інтанавання павінна адбывацца падчас складання «выканальніцкай партытуры» – графічнай разметкі тэксту. З улікам гэтых задач намі былі падрыхтаваны матэрыялы для правядзення канстатуючага зрэзу, які прадугледжваў аналіз:

1. характару асобных вучнёўскіх уяўленняў пра рытміка-меладычную арганізацыю маўлення;

2. узроўню практычнага валодання сродкамі інтанацыі для перадачы як рацыянальна-лагічных, так і эмацыянальна-валюнтатыўных асаблівасцей выказвання;

3. ступені сфарміраванасці ўменняў па складанні партытуры тэксту і ўзроўню падрыхтаванасці вучняў да самастойнага агучвання тэксту ў адпаведнасці з яго папярэднім інтанацыйным падзелам.

Канстатуючая дыягностыка праводзілася сярод 89 навучэнцаў СШ № 4 і 138 г. Мінска. Вырашэнню пастаўленых задач спрыяла, у прыватнасці, наступная работа: вучням 11 класа было прапанавана агучыць паведамленне па матэрыялу падручніка, зрабіўшы пры гэтым графічную разметку тэксту на аснове ўсіх законаў і правіл інтанацыйнага падзелу.

Пераходзячы да аналізу атрыманых вынікаў, адзначым, што асноўная функцыя навуковага паведамлення, вядома, – у перадачы інфармацыі. Таму падкрэсленая лагічнасць выступае як вызначальная стылістычная і выканальніцкая рыса навуковых прамоў. Тэкст навуковага стылю дазваляе выявіць перш за ўсё узровень сфарміраванасці ўменняў па карыстанні такімі рытміка-інтанацыйнымі сродкамі, як паўзацыя і акцэнтуацыя, пры сэнсава-лагічным упарадкаванні маўленчага матэрыялу.

Матэрыял канстатуючага зрэзу засведчыў, што найвялікшую долю зафіксаваных недахопаў у інтанаванні навуковых тэкстаў складаюць акцэнтаванне з парушэннем правіл лагічнага цэнтравання і неаптымальны паўзацыйны падзел сказаў на сэнсава адзіныя часткі (сінтагмы).

Названыя парушэнні ў выкарыстанні інтанацыйна-лагічных сродкаў выразнасці ў першую чаргу закранаюць акцэнтныя вылучэнні, якія часцей за ўсё носяць аўтаматызаваны характар: паводле асаблівасцей

рытмічнага ладу славянскіх моў, пад лагічны націск трапляе звычайна канчатковае слова сінтагмы і фразы. Выканальнікамі падчас вымаўлення ігнаруюцца лагічна больш значныя лексемы. Яны, наадварот, прамаўляюцца хутка і ціха. Гэта ілюструе і графічны падзел тэкстаў, напрыклад: *Ва ўступнай частцы/ з дапамогай фактаў,/ аргументаў раскрываецца сутнасць тэмы.//* (пажаданым было б праакцэнтаваць словы *ўступнай, фактаў, аргументаў, сутнасць*). Падобныя адхіленні ад лагічна матываванага інтанавання неаднаразова фіксуюцца ў 84,3 % прааналізаваных прац.

За межы сэнсавага вылучэння могуць выносіцца словы, якія патрабуюць абавязковага акцэнтавання ў фразах з супастаўленнем: *Прамова павінна даваць адказ на пытанні:/ што трэба зрабіць?/ чаму гэта неабходна зрабіць?* (прыблізна ў пятай частцы выканальніцкіх партытур, складзеных вучнямі, нематывавана не вылучаліся пытальныя словы *што* і *чаму*).

Распаўсюджаным аказалася «інтанацыйнае нівеліраванне» тых атрыбутыўных кампанентаў у тэрміналагічных словазлучэннях, якія маюць найбольшую сэнсавую вагу (*публічная прамова, інфармацыйная прамова, у асноўнай частцы*).

Нізкая ступень валодання ўменнем вылучаць істотнае, перадаваць дакладна змест выказвання праяўляецца ў парушэннях падзелу фраз на сінтагмы. Сустракаюцца неапраўданыя паўзы, што супярэчаць законам сінтаксічнай сувязі ў фразе і камунікатыўна абумоўленаму чляненню выказвання: *Поспех публічнага выступлення ў многім/ залежыць ад таго, наколькі/ добра прамоўца ведае прадмет гаворкі,/ наколькі дасканала прамова/ падрыхтавана і прадумана* (Пар. з больш удалым варыянтам: *Поспех публічнага выступлення/ ў многім залежыць ад таго,/ наколькі добра/ прамоўца ведае прадмет гаворкі,/ наколькі дасканала/ прамова падрыхтавана/ і прадумана)*. Не зусім асэнсаванае стаўленне вучняў да ўжывання рытміка-інтанацыйных сродкаў праяўляецца часам у празмернай, часам у недастатковай паўзацыі, што прыводзіць да хібаў у лагічным цэнтраванні фраз.

Мастацкае маўленне дае магчымасць асэнсаваць ступень удаласці больш тонкага, нюансаванага, эмацыянальна афарбаванага ужывання інтанацыйных сродкаў. У сувязі з гэтым вучням прапаноўваліся фрагменты, якія вызначаліся варыятыўнасцю пажаданага інтанацыйнага афармлення сказаў.

У значнай колькасці даследаваных выпадкаў сустракаюцца таксама адхіленні ад лагічна матываванага інтанавання, якія з’яўляюцца аналагавымі адзначым у навуковым маўленні. Напрыклад: *І перад навальніцаю ўсё на зямлі бытта паменшыла,/ і нават вёска здавалася маленькай,*

*нібы глядзіш на яе з вышыні,/ з гэтага магутнага,/ чорнага, навальнічнага крыла*. Так, пажадана было б акцэнтаваць словы *усё, паменшыла, вёска, маленькай, вышыні*, дадаць паўзу пасля аднароднага элемента – прыметніка *чорнага*.

Адлюстраванне эмацыянальнай афарбоўкі ўрыўкаў, настрой якіх змяняецца на працягу апісання прыроднай з'явы, у прыватнасці навальніцы, характарызавалася недастатковай разнастайнасцю сваіх рэсурсаў. Частка школьнікаў не дасягала паслядоўнасці і выразнасці ў дынамічным размеркаванні сілы голасу і належным выкарыстанні тэмпу маўлення для перадачы адпаведнага стану і настраёвага фону. Гэта праяўлялася ў неадэкватным апісанай сітуацыі агучванні матэрыялу. Напрыклад, наступны урывак: *А адтуль/ чорным крылом/ разгортвалася навальніца.// І перад ёй усё заціхала,/ неяк паспешна, быццам захопленае знянацку,// нават паменшалі хвалі на тугаватай роўнядзі калосся. І нідзе/ ні душы*. У большасці выпадкаў (65,2 % прачытанняў) выконваўся гучна, што не адпавядае зместу і эмацыянальнай афарбоўцы дадзенага кантэксту.

Аналіз матэрыялаў эксперыменту вымушае прызнаць неабходнасць дадатковага ўдасканалення працы над партытурным аналізам гукавога боку выказванняў і дае магчымасць канкрэтызаваць склад тых уменняў, да развіцця якіх павінна павялічвацца ўвага пры навучанні школьнікаў выразнай інтанацыі. Важна пры гэтым браць пад ўвагу, што працу над інтанаваннем мэтазгодна арганізоўваць на ўсіх этапах і ступенях навучальнага працэсу, а інтанацыю разглядаць як комплексны феномен ва ўсёй разнастайнасці яе кампанентаў. Не менш значна спалучаць развіццё эмацыянальнай выразнасці маўлення з выхаваннем моўнага густу, фарміраванем пачуццёвага патэнцыялу школьнікаў.

## ВОБРАЗ БРАТЧЫКА-ХРЫСТА Ў РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА «ХРЫСТОС ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў ГАРОДНІ»

**І. В. Макарэвіч**

Па асэнсаванні біблейскага матэрыялу раман У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» займае асаблівае і значнае месца ў беларускай літаратуры. Мастацкая сістэма рамана насычана цытатамі і эпіграфамі, аллюзіямі і рэмінісцэнцыямі, якія, як адзначае Е. Лявонава, «адсылаюць да твораў розных эпох і народаў і, павышаючы агульны філасофска-этычны і эстэтычны патэнцыял кнігі, вымагаюць ад чытача інтэнсіфікацыі яго асацыятыўных здольнасцей» [3, с. 44]. Дабро і зло, каханне і нянавісць, пачварлівае і ўзвышанае, жыццё і смерць не проста